УДК 070(043.3) + 808.26(043.3)

# МЕДЫЯТЭКСТ У КАНТЭКСЦЕ ПЕРЫЯДЫЗАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЖУРНАЛІСТЫКІ

***Ю. В. МАЛІЦКІ***[1*, 2*]

[1*]*Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі, вул. Сурганава, 1, корп. 2, 220072, г. Мінск, Беларусь*
[2*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

***Анатацыя.*** Аналізуюцца прынцыпы перыядызацыі развіцця публіцыстычнага (медыйнага) тэксту, прынятыя ў гісторыі беларускай журналістыкі. Тэарэтычна абгрунтоўваецца аўтарскі падыход да перыядызацыі гісторыі беларускага медыятэксту, заснаваны на сувязі з этапамі станаўлення беларускай літаратурнай мовы.

***Ключавыя словы:*** медыялінгвістыка; медыятэкст; журналістыка; беларуская журналістыка; гісторыя беларускай журналістыкі.

# МЕДИАТЕКСТ В КОНТЕКСТЕ ПЕРИОДИЗАЦИИ БЕЛОРУССКОЙ ЖУРНАЛИСТИКИ

***Ю. В. МАЛИЦКИЙ***[1), 2)]

[1)]*Институт языкознания имени Якуба Коласа НАН Беларуси, ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, г. Минск, Беларусь*
[2)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

***Аннотация.*** Анализируются принципы периодизации развития публицистического (медийного) текста, принятые в истории белорусской журналистики. Теоретически обосновывается авторский подход к периодизации истории белорусского медиатекста, основанный на связи с этапами формирования белорусского литературного языка.

***Ключевые слова:*** медиалингвистика; медиатекст; журналистика; белорусская журналистика; история белорусской журналистики.

**Образец цитирования:**
Маліцкі ЮВ. Медыятэкст у кантэксце перыядызацыі беларускай журналістыкі. *Журнал Белорусского государственного университета. Журналистика.* 2025;1:59–65.
EDN: WMJQBU

**For citation:**
Malitski YuV. Media text in the context of periodisation of Belarusian journalism. *Journal of the Belarusian State University. Journalism.* 2025;1:59–65. Belarusian.
EDN: WMJQBU

**Автор:**
***Юрий Вячеславович Малицкий*** – кандидат филологических наук; докторант[1)], доцент кафедры медиалингвистики и редактирования факультета журналистики[2)].

**Author:**
***Yuri V. Malitski***, PhD (philology); doctoral student[a] and associate professor at the department of media linguistics and editing, faculty of journalism[b].
*malitski@bsu.by*
*https://orcid.org/0000-0003-1315-5178*

CC BY NC

# MEDIA TEXT IN THE CONTEXT OF PERIODISATION OF BELARUSIAN JOURNALISM

***Yu. V. MALITSKI***[a, b]

[a]*Institute of Linguistics named after Yakub Kolas, National Academy of Sciences of Belarus, 1 Surganava street, 2 building, Minsk 220072, Belarus*
[b]*Belarusian State University, 4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

***Abstract.*** The principles of periodisation of the development of journalistic (media) text adopted in the history of Belarusian journalism are analysed. The author's approach to the periodisation of the history of the Belarusian media text, based on connections with the stages of formation of the Belarusian literary language, is theoretically substantiated.

***Keywords:*** media linguistics; media text; journalism; Belarusian journalism; history of Belarusian journalism.

## Уводзіны

У апошнія дзесяцігоддзі ў ходзе навуковага абмеркавання аспектаў функцыянавання глабальнай інфармацыйнай прасторы актуалізавалася думка аб тым, што інфармацыя гістарычна выступала ў якасці аднаго з асноўных фактараў сацыяльнага прагрэсу [1]. Як феномен матэрыяльнай і духоўнай сфер быцця, яна звязвае чалавека са з'явамі і натуральнай, і штучнай прыроды, мае статус аб'ектыўнай характарыстыкі сацыяльных сістэм, якая забяспечвае іх унутранае развіццё і знешнія кантакты, сінхранізацыю і каардынацыю дзеянняў. Іншымі словамі, сацыяльнае жыццё немагчыма без інфармацыі і наладжанага ўзаемадзеяння паміж яго ўдзельнікамі.

Ключавая роля інфармацыі ў забеспячэнні функцыянавання грамадства абумоўлівае асаблівы змест і значэнне СМІ. Эфектыўнасць прымянення медыя для рэгулявання грамадскіх адносін і кіравання імі базіруецца на здольнасці СМІ ўплываць як на канкрэтнага індывіда, так і на шырокія масы. Паводле Г. М. Маклюэна, медыя з'яўляюцца «пашырэннямі чалавечых пачуццяў»[1] [2, с. 14], яны уздзейнічаюць на адрасата не на ўзроўні ідэй і меркаванняў, а на ўзроўні эмоцый і пачуццяў і змяняюць «пачуццёвыя прапорцыі, або ўзоры ўспрымання» [2, с. 22]. Непасрэдна ўплываючы на эмацыйную сферу, медыяпаведамленне валодае прынцыпова іншымі сугестыўнымі характарыстыкамі ў параўнанні з іншымі тыпамі тэкставых утварэнняў. Другая асаблівасць медыяпаведамлення, якая вызначае высокую ступень эфектыўнасці прымянення медыя ў рэгуляванні грамадскіх адносін, заключаецца ў магчымасці канструяваць і (або) карэкціраваць карціну свету шляхам фарміравання інфармацыйнай плыні ў адпаведнасці з прагматычнымі мэтамі суб'екта медыямаўлення [3].

Разуменне важнасці інфармавання як інструмента трансляцыі пункту погляду кіруючых сацыяльна-палітычных груп і арганізацый на падзеі рэчаіснасці сфарміравалася ўжо на ранніх этапах зараджэння беларускай дзяржавы. Са з'яўленнем і удасканальваннем новых сродкаў друку і перадачы інфармацыі пераасэнсоўваўся і характар уздзеяння медыя на грамадства. Працэс канструявання і распаўсюджвання інфармацыйных паведамленняў атрымаў істотнае тэхнолага-метадалагічнае развіццё і эвалюцыйна трансфармаваўся ў паўнавартасную сацыяльна-прафесійную сферу – журналістыку, асобную галіну навуковага пазнання [4] і «палітычную падсістэму, якая з'яўляецца ўплывовай часткай палітычнага працэсу» [5, с. 201].

## Тэарэтычныя асновы даследавання

Пытанне перыядызацыі лічыцца краевугольным каменем у даследчым полі любой навуковай дысцыпліны і ўстойлівай праблемай пры характарыстыцы з'яў з унутранай логікай развіцця. У навуковым дыскурсе пад перыядызацыяй прынята разумець вылучэнне ў гісторыі таго ці іншага феномена часавых інтэрвалаў, якія валодаюць пэўнымі вызначальнымі прыметамі, абумоўленымі акалічнасцямі знешняга або ўнутранага характару. Асноўная праблема навуковай перыядызацыі заключаецца ў выяўленні суадносін заканамернасцей эвалюцыі грамадства і заканамернасцей эвалюцыі прадмета даследавання. У гэтым аспекце перыядызацыя выконвае задачы структуравання гісторыка-факталагічнага матэрыялу ў храналагічнай паслядоўнасці.

Існуюць два асноўныя падыходы да вывучэння гісторыі развіцця сацыяльна-гуманітарных з'яў:

• гістарычны падыход, што заснаваны на адлюстраванні эвалюцыі прадмета даследавання ў сувязі з абставінамі аб'ектыўнай рэальнасці як асноўнымі фактарамі развіцця;

• лагічны падыход, што заснаваны на характарыстыцы эвалюцыі прадмета даследавання ў храналагічнай залежнасці ад уласных, унутраных прагрэсіўных тэндэнцый.

[1]Тут і далей пераклад наш. – *Ю. М.*

У выніку рэалізацыі гістарычнага падыходу ў адносінах да журналістыкі вылучэнне перыядаў яе развіцця ажыццяўляецца праз сувязь з гістарычнымі часавымі адрэзкамі і падзеямі (напрыклад, журналістыка паслярэформеннага перыяду, журналістыка перыяду Першай сусветнай вайны, журналістыка міжваеннага часу і г. д.). Прымяненне другога, лагічнага падыходу ў дачыненні да журналістыкі дазваляе ўстанавіць такія этапы яе развіцця, як, напрыклад, пражурналістыка, уласна журналістыка і постжурналістыка.

Характар апісання эвалюцыі аб’екта навуковага інтарэсу, як правіла, вызначаецца прыярытэтнымі задачамі канкрэтнага даследавання і залежыць ад анталагічных асаблівасцей прадмета вывучэння. Гісторыя беларускай журналістыкі ўзнікла і развівалася ў першую чаргу як дыдактычная дысцыпліна, асноўная ўвага якой была скіравана на «перадумовы, заканамернасці і факты працэсу станаўлення і развіцця беларускай журналістыкі»[2]. Такое бачанне прадмета даследавання абумовіла асноўную мэту дысцыпліны – фарміраванне «цэласнага ўяўлення аб эвалюцыі беларускай публіцыстычнай думкі ад пражурналісцкіх з’яў да высокатэхналагічнага журналізму сучаснасці»[3]. Адной з асноўных задач гісторыі беларускай журналістыкі як вучэбнай дысцыпліны выступае перадача «сістэмы канцэптуальна-гістарычных ведаў»[4], што і абумовіла першачарговую ўвагу навукоўцаў да перадумоў і аб’ектыўных акалічнасцей працэсу станаўлення і развіцця беларускай журналістыкі. Такім чынам, арыентацыя на факталагічную рэтраспекцыю пры характарыстыцы дынамікі развіцця беларускай журналістыкі вызначыла адпаведны падыход да вырашэння праблемы яе перыядызацыі. Найбольш аўтарытэтныя работы айчынных даследчыкаў у пытаннях перыядызацыі вытрыманы ў рэчышчы менавіта гістарычнага пункту погляду.

## Вынікі і іх абмеркаванне

Першым фундаментальным даследаваннем, прысвечаным пытанню перыядызацыі гісторыі айчыннай медыясістэмы, з’яўляецца «Гісторыя беларускай журналістыкі» (1979). Яе аўтары, Р. В. Булацкі, І. І. Сачанка і С. В. Говін, вырашаюць праблему хроналагічнага падзелу гісторыі журналістыкі за кошт суаднясення асаблівасцей развіцця публіцыстычнай думкі на беларускіх землях з этапамі дэмакратычнага і сацыялістычнага руху ў Расійскай імперыі: «…вызваленчы рух у Расіі прайшоў тры галоўныя этапы адпаведна тром галоўным класам рускага грамадства, якія накладалі свой адбітак на рух: 1) перыяд дваранскі, прыкладна з 1825 па 1861 год; 2) разначынскі, або буржуазна-дэмакратычны, прыблізна з 1861 па 1895 год; 3) пралетарскі, з 1895 па цяперашні час. У курсе гісторыі беларускай журналістыкі разглядаюцца заканамернасці развіцця друку ў былым Паўночна-Заходнім краі ў дваранскі, разначынскі, або буржуазна-дэмакратычны, і пралетарскі перыяды вызваленчага руху ў Беларусі» [6, с. 3].

Аўтар вучэбна-метадычнага комплексу «Гісторыя беларускай журналістыкі (1563–1917 гг.)» (2003) С. В. Говін асвятляе аспекты станаўлення айчыннай журналістыкі з прынцыпова іншых філасофска-гістарычных і метадалагічных пазіцый. У яго працы месца, роля і характар развіцця друкаваных СМІ разглядаюцца ў «розныя перыяды жыцця беларускага народа: у складзе магутных еўрапейскіх дзяржаў – Рэчы Паспалітай і Вялікага княства Літоўскага, Расійскай імперыі»[5]. Вучэбна-метадычны комплекс С. В. Говіна наглядна дэманструе прынцыповыя змены, якія адбыліся ў апошняе дзесяцігоддзе XX ст. у парадыгме аналізу фактаў і тэндэнцый развіцця беларускай журналістыкі: сацыяльна-класавы падыход саступіў месца нацыянальна-дзяржаўнаму. Перыяды гістарычнага фарміравання нацыянальнай медыясістэмы ў працы не вылучаны, аднак аўтарскі падыход да сістэматызацыі фактаў знайшоў увасабленне ў наступнай зместава-тэматычнай арганізацыі лекцыйнага матэрыялу: 1. Узнікненне друкаваных перыядычных выданняў на тэрыторыі Беларусі. 2. Друк Беларусі напярэдадні і ў час паўстання 1863–1864 гг. 3. Беларуская журналістыка ў парэформенны перыяд. 4. Друк Беларусі ў перыяд стварэння рухаў і арганізацыі партый (1895–1904). 5. Беларуская журналістыка ў гады першай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў Расіі (1905–1907). 6. Журналістыка Беларусі ў перыяд нарастання рэвалюцыйнай барацьбы і Першай сусветнай вайны (чэрвень 1907 г. – люты 1917 г.). 7. Друк Беларусі ў час падрыхтоўкі і правядзення кастрычніцкага перавароту (сакавік – кастрычнік 1917 г.)[6]. Падставай для вылучэння большасці этапаў з’яўляюцца гістарычныя падзеі (напрыклад, паўстанне 1863–1864 гг., першая буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыі ў Расіі) або сацыяльныя працэсы, звязаныя з гэтымі падзеямі ці абумоўленыя імі (напрыклад, перыяд стварэння рухаў і арганізацыі партый, перыяд нарастання рэвалюцыйнай барацьбы). Такі падыход дазваляе выявіць фактары, якія, па меркаванні аўтара, аказалі найбольшы ўплыў на ход развіцця беларускай журналістыкі ў 1563–1917 гг. Вызначальнымі гістарычнымі

[2]*Слука О. Г., Дорощёнок П. Л., Зубченок Н. А.* История белорусской журналистики : пример. учеб. программа по учеб. дисциплине для специальности 1-23 01 08 «Журналистика (по направлениям)». Минск : БГУ, 2015. 24 с.
[3]Там же.
[4]Там же.
[5]*Говін С. В.* Гісторыя беларускай журналістыкі (1563–1917 гг.) : вучэб.-метад. комплекс. Мінск : БДУ, 2003. 99 с.
[6]Там жа.

падзеямі ў акрэслены адрэзак часу ён лічыць паўстанне 1863–1864 гг., Першую сусветную вайну, першую буржуазна-дэмакратычную рэвалюцыю ў Расіі (1905–1907), а таксама Кастрычніцкую рэвалюцыю. Ключавую ролю ў фарміраванні беларускай публіцыстычнай думкі, па меркаванні С. В. Говіна, адыграў народніцкі рух сярэдзіны 1870-х – першай паловы 1890-х гг., што разгарнуўся і набыў асаблівую моц на беларускіх землях пасля зацвярджэння ў Расійскай імперыі 6 красавіка 1865 г. цэнзурнай рэформы. У канцы XIX – пачатку XX ст. таксама адбылася рэзкая інтэнсіфікацыя працэсаў фарміравання сацыяльна-палітычных арганізацый і партый, выкліканая эканамічна-прамысловым уздымам і актыўным пашырэннем сацыял-дэмакратычных і нацыянальных ідэй сярод насельніцтва Паўночна-Заходняга краю, якая абумовіла рост сацыяльна-палітычнай напружанасці ў 1907–1917 гг.

У рамках нацыянальна-дзяржаўнага падыхода да пытання перыядызацыі гісторыі беларускай журналістыкі падрыхтаваны падручнік для студэнтаў і творчых работнікаў сферы камунікацыі «Беларуская журналістыка» (2011). Яго аўтар, прафесар А. Г. Слука, акцэнтуе ўвагу на «заканамернасцях адлюстравання рэчаіснасці ў публіцыстычных творах»[7] і аналізуе значэнне нацыянальнай медыясістэмы ў працэсе сацыяльна-эканамічнага развіцця і фарміравання беларускай грамадзянскай супольнасці. Такое вызначэнне мэты даследавання акрэсліла выкарыстанне своеасаблівага, камбінаванага падыхода да храналагічна-тэматычнага падзелу матэрыялу ў працы. Выключна гістарычны погляд, рэалізаваны ў вучэбна-метадычным комплексе «Гісторыя беларускай журналістыкі (1563–1917 гг.)», у падручніку А. Г. Слукі атрымаў развіццё і пашырэнне за кошт уліку фактараў знешняга (грамадска-палітычнага) і ўнутранага (сістэмнага) характару. Гэта развіццё адлюстравана ў вылучэнні, з аднаго боку, такіх раздзелаў, як «Журналістыка Беларусі ў працэсе ўсталявання аднапартыйнай сістэмы», «Беларуская журналістыка ў перыяд крызісу сацыялізму (1965–1985 гг.)», «Беларускія СМІ ў час трансфармацыі савецкага грамадства (1986–1991 гг.)» і інш., а з другога боку – раздзелаў «Ідэалогія сацыялізму ў беларускай журналістыцы», «Стварэнне сістэмы сродкаў масавай інфармацыі ў Беларусі (1954–1964 гг.)». Важнымі этапамі ў працэсе развіцця беларускай журналістыкі А. Г. Слука лічыць ўзнікненне беларускага радыёвяшчання і тэлебачання. У якасці асноўных фактараў эвалюцыі гэтых СМІ у нашай краіне даследчык называе стварэнне адпаведных тэхніка-тэхналагічных ўмоў: развіццё інфраструктуры для ажыццяўлення працэсу радыёфікацыі (пашырэнне сеткі праваднога вяшчання, павелічэнне колькасці радыёвузлоў, наладжванне выпуску беларускага радыёабсталявання і радыёпрыёмнікаў, адкрыццё радыётэхнічнага інстытута) і тэлевяшчання (пабудова рэтрансляцыйных станцый і тэлевізійных цэнтраў, удасканаленне матэрыяльна-тэхнічнай базы тэлестудый, фарміраванне сістэмы падрыхтоўкі адпаведных кадраў і г. д.).

На прынцыпе адлюстравання гістарычнага развіцця журналістыкі ў сувязі з вызначальнымі грамадска-палітычнымі падзеямі заснаваны і тэматычны падзел матэрыялу ў дапаможніку «Беларуская журналістыка (1563–2021 гг.)»[8]. Аўтары вучэбнага выдання прапануюць наступную перыядызацыю працэсу эвалюцыі беларускай журналістыкі: 1) узнікненне першых перыядычных выданняў у Беларусі (з 1563 г.); 2) беларуская журналістыка (1860–70-я гг.); 3) друк Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст.; 4) друк Беларусі ў перыяд рэвалюцыі (1905–1907); 5) беларуская журналістыка (1907–1917); 6) бальшавісцкі друк Беларусі і яе ўдзел у барацьбе за ўмацаванне ўлады Саветаў (1917–1918); 7) друк Беларусі ў гады грамадзянскай вайны і замежнай ваеннай інтэрвенцыі (1918–1919); 8) друк Беларусі ў гады польска-савецкай вайны (1919–1920); 9) друк Беларусі ў гады ўзнаўлення і развіцця народнай гаспадаркі (1921–1925); 10) друк Беларусі (1926–1930); 11) беларускі друк (у тым ліку друк заходняй Беларусі; 1930-я гг.); 12) друк Беларусі ў час Вялікай Айчыннай вайны; 13) беларуская журналістыка аб праблемах развіцця народнай гаспадаркі Беларусі ў пасляваенныя гады (1944–1955); 14) развіццё сістэмы друкаваных сродкаў масавай камунікацыі ў Беларусі (1954–1964); 15) развіццё радыё і тэлебачання ў Беларусі (1960–80-я гг.); 16) беларускі перыядычны друк (1965–1990); 17) прэса Беларусі на сучасным этапе.

Іншыя падыходы да перыядызацыі гісторыі развіцця журналістыкі прадэманстраваны ў навуковых працах, прысвечаных асобным працэсам у сферы айчыннай масавай камунікацыі. Так, даследуючы гісторыю арганізацыйнай дзейнасці СМІ ў Беларусі (пад арганізацыйнай дзейнасцю разумеецца «сукупнасць механізмаў узаемадзеяння медыя з аўдыторыяй і інстытутамі ўлады для кансалідацыі грамадства, кіравання актыўнасцю аўдыторыі і фарміравання актуальнага парадку дня» [7, с. 10]), А. Д. Барэйка вылучае тры перыяды эвалюцыі журналістыкі: 1) савецкі (1950–1990); 2) постсавецкі (1991–1999); 3) сучасны (з 2000 г.). У якасці крытэрыю, які ляжыць у аснове гэтай перыядызацыі, выступаюць спосабы ўзаемадзеяння СМІ з аўдыторыяй і іх функцыя ў працэсе рэгулявання адносін паміж суб'ектамі грамадскай камунікацыі. Гэтыя спосабы вызначаюцца палітычнай арганізацыяй соцыуму. Такім чынам, акрэсленыя перыяды (савецкі, постсавецкі) цесна звязаны з формай дзяржаўнага ладу.

[7]*Слука А. Г.* Беларуская журналістыка : падручнік. Мінск : БДУ, 2011. С. 2.
[8]*Дорощёнок П. Л., Коршук В. В.* Белорусская журналистика (1563–2021 гг.) : пособие. Мінск : БГУ, 2022. 135 с.

Найбольш распаўсюджаныя прынцыпы навуковай перыядызацыі развіцця як усёй сістэмы СМІ, так і яе прыватных галін у пераважнай большасці выпадкаў вызначаюцца сувяззю суб'ектаў і форм існавання інфармацыйнай прасторы са шматлікімі знешнімі (гістарычнымі, філасофска-цывілізацыйнымі, палітычнымі, сацыяльнымі, арганізацыйнымі, эканамічнымі, культурнымі і г. д.) аб'ектыўнымі матэрыяльнымі і нематэрыяльнымі з'явамі. Аднак інфармацыя і характар яе данясення да шырокіх слаёў насельніцтва іграюць важную ролю не толькі для азнаямлення з актуальнымі навінамі, але і для факусіроўкі погляду на гэтых падзеях з грамадзянскіх і нацыянальных пазіцый. «Гістарычны вопыт сведчыць, што асноўнымі фактарамі фарміравання самасвядомасці беларускага этнасу былі родная мова, а таксама працэсы ўзнікнення нацыі і стварэння самастойнай дзяржавы» [8, с. 57]. Фармалізуючы камунікацыю праз мову, блізкую большасці насельніцтва беларускіх земляў, медыя выконвалі і працягваюць выконваць надзвычай важную функцыю кансалідацыі беларускага грамадства на нацыянальным культурным і лінгвістычным падмурку. Адпаведна, далучэнне моўных характарыстык да ліку асноўных паказчыкаў медыйнага тэксту, па нашым меркаванні, з'яўляецца цалкам натуральным і абгрунтаваным. Глыбокае і ўсебаковае даследаванне тэкстаў СМІ, акрамя разгляду камунікатыўных, семіятычных і іншых адзнак, павінна ўключаць і аналіз іх моўных рыс у кантэксце гістарычных абставін. У сувязі з гэтым беларускі медыятэкст варта разглядаць як публіцыстычны твор на беларускай мове, які ў канкрэтную эпоху з'яўляецца адлюстраваннем магістральных працэсаў камунікацыі ў грамадстве з улікам кадыфікаванай нормы ў якасці выніку выбару найбольш распаўсюджаных у маўленні слоў і форм.

Фарміраванне, функцыянаванне і развіццё беларускага медыятэксту цесна звязана з эвалюцыяй публіцыстыкі. Вядома, што функцыянальная стылістыка ўзнікла як самастойны даследчы напрамак ў лінгвістыцы славянскіх моў у першай палове XX ст., аднак выкарыстанне стылістычных рэсурсаў пачалося раней – у часы стварэння літаратурных форм славянскіх моў. Улічваючы перарваную традыцыю развіцця беларускай літаратурнай мовы, можна засведчыць той факт, што беларускі медыятэкст адыграў вельмі значную ролю ў станаўленні новай літаратурнай формы нашай мовы ў пачатку XX ст. і стаў вызначальным фактарам з'яўлення айчыннай стылістыкі як самастойнага лінгвістычнага адгалінавання.

Узнікненне беларускага медыятэксту абумоўлена афармленнем публіцыстычнага стылю ў Беларусі і карэлюецца з этапамі развіцця беларускай журналістыкі. Пры гэтым трэба ўлічваць, што паняцці публіцыстычнага стылю і журналістыкі амбівалентныя, таму пры ўстанаўленні перыядызацыі гісторыі развіцця беларускага медыятэксту, на нашу думку, варта абапірацца на этапы станаўлення беларускай літаратурнай мовы як на базавы параметр.

У айчыннай лінгвістычнай навуцы традыцыйным з'яўляецца падыход да перыядызацыі гісторыі развіцця беларускай мовы, які прадугледжвае ўдзяленне прыярытэтнай увагі даследчыкаў экстралінгвістычным акалічнасцям як асноўным фактарам фарміравання нацыянальнай камунікатыўнай сістэмы ў гістарычнай перспектыве. «Паколькі аснову развіцця мовы складае развіццё грамадства, гісторыя народа – тварца і носьбіта дадзенай мовы, то і перыядызацыя гісторыі беларускай літаратурнай мовы ў першую чаргу павінна ўлічваць важнейшыя перыяды гісторыі беларускага народа»[9]. Пры гэтым адзначаецца, што сувязь мовы з гісторыяй народа «выяўляецца перш за ўсё у тым, што само развіццё форм моўных зносін, змены ў функцыянальна-стылявой разнастайнасці мовы цесна звязаны з гістарычнымі зменамі ў аб'ёме, складзе і сацыяльнай сутнасці народа як гістарычнай катэгорыі»[10].

Прынцып храналагічнай сістэматызацыі развіцця любой мовы прадугледжвае ўдзяленне пільнай даследчыцкай ўвагі такім базавым этапам, як пераход ад мовы племені да мовы народнасці, ад мовы народнасці да мовы нацыі. Прымяненне гэтага прынцыпу да працэсу фарміравання беларускай мовы дазваляе вылучыць як мінімум два перыяды: умоўна старажытны (час існавання ўсходнеславянскай і пазней беларускай народнасцей з уласцівымі ім камунікатыўнымі сістэмамі) і ўмоўна новы (час фарміравання беларускай нацыі з характэрнай ёй нацыянальнай мовай) перыяды.

Пад нацыянальнай мовай разумеецца мова, якая мае пэўнае пашырэнне і высокі ўзровень унутрысістэмнага развіцця. У аснове нацыянальнай мовы ляжыць яе літаратурная (нармаваная і кадыфікаваная) форма. Гэта форма мовы рэалізуецца ў навуковай, дзелавой, публіцыстычнай, мастацкай і іншых стылістычных разнавіднасцях і забяспечвае функцыянаванне ўсіх сфер грамадскага жыцця. Такім чынам, перыядызацыя гісторыі беларускай мовы як мовы нацыі павінна вызначацца ў сувязі з найважнейшымі этапамі развіцця нацыянальнай грамадска-палітычнай, публіцыстычнай, літаратурна-мастацкай думкі, а таксама з улікам аб'ектыўных гістарычных абставін, што абумовілі яе сучасны стан. Адпаведна, згаданы вышэй першасны падзел працэсу фарміравання беларускай мовы на старажытны і новы перыяды ўскладняецца. Так, гісторыкамі

---

[9]*Шакун Л. М.* Нарысы гісторыі беларускай літаратурнай мовы : дапам. для студэнтаў філалаг. фак. ВНУ. Мінск : Дзярж. вучэб.-пед. выд-ва М-ва асветы БССР, 1960. С. 6.

[10]Там жа.

мовы былі вылучаны тры асноўныя перыяды развіцця беларускай літаратурнай мовы. У розных навуковых працах іх назвы вар'іруюцца, аднак часавыя межы этапаў і сутнасць дыферэнцыяльных паказчыкаў, пакладзеных у аснову перыядызацыі, супадаюць. Даследчыкі беларускай мовы класіфікуюць перыяды яе фарміравання наступным чынам:

1) перыяд існавання агульнаўсходнеславянскай (старажытнарускай) літаратурнай мовы (XI–XIV стст.);

2) перыяд існавання старабеларускай літаратурнай мовы (XIV–XVIII стст.);

3) перыяд існавання новай (сучаснай) беларускай літаратурнай мовы (XIX ст. – наш час).

Кожнаму з гэтых перыядаў, апроч дзяржаўна-палітычных і сацыяльна-эканамічных акалічнасцей, адпавядаюць спецыфічныя формы рэалізацыі грамадскай камунікацыі і моўныя сродкі яе арганізацыі.

Першаму перыяду характэрна з'яўленне і актыўнае пашырэнне на славянскіх землях розных відаў рэлігійнай і гістарычнай літаратуры. У гэтых творах, на думку гісторыкаў журналістыкі і гісторыкаў мовы, закладваліся асновы ўсходнеславянскай (у тым ліку беларускай) публіцыстыкі. Узнікненне першых літаратурных помнікаў, якія ў той ці іншай ступені мелі рысы публіцыстычнасці, прыпадае на час існавання Кіеўскай Русі і час яе распаду на дробныя княствы. Прыкладамі такіх твораў з'яўляюцца «Слова аб законе і благадаці» мітрапаліта Іларыёна (сярэдзіна XI ст.), «Казанне пра Барыса і Глеба» (мяжа XI–XII ст.), «Аповесць мінулых гадоў» (пачатак XII ст.), «Слова аб палку Ігаравым» (XII ст.), «Жыціе Аўрамія Смаленскага» (канец XII – пачатак XIII ст.), «Жыціе Ефрасінні Полацкай» і інш. Знешнепалітычная барацьба, міжусобныя ваенныя канфлікты, унутрыдзяржаўныя супярэчнасці абвастрылі неабходнасць у асэнсаванні і інтэрпрэтацыі актуальных падзей, а таксама ў выражэнні стаўлення да іх. Названыя помнікі засведчылі пачатак фарміравання спосабаў канструявання тэкставых адзінак грамадскай камунікацыі, а таксама прынцыпаў адбору маўленчых сродкаў рэалізацыі аўтарскай задумы з мэтай найбольш эфектыўнага вырашэння прагматычных задач.

Другі перыяд характарызуецца канчатковым афармленнем беларускай літаратурнай мовы з усімі яе спецыфічнымі рысамі. Ён храналагічна супадае з працэсам фарміравання беларускай народнасці ў складзе Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Літаратурнымі помнікамі, якія маюць публіцыстычныя элементы падачы інфармацыі і адпаведныя моўна-стылістычныя асаблівасці, лічацца «Летапісец вялікіх князёў Літоўскіх» (XIV ст.), «Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.» (XV ст.), «Хроніка Літоўская і Жамойцкая» («Вывод и початок о Великом князстве Литовском и Жмойтском. Отколь взмоглися и пошли»), «Хроніка Быхаўца» (XVI ст.) і інш. Сярод асноўных прымет, што вызначаюць ідэйны пафас летапісца як сярэднявечнага публіцыста, даследчыкі згадваюць паслядоўнасць аўтара ў адстойванні дзяржаўнага суверэнітэту Вялікага княства Літоўскага, самастойнасць ў пытаннях уладкавання гістарычнага лёсу народаў, характэрны тэматычны спектр падзей, якія апісваюцца (унутраная і знешняя палітыка дзяржаў, ваенныя канфлікты ў рэгіёне і свеце, сацыяльна-палітычныя і эканамічныя акалічнасці развіцця гарадоў)[11]. Стыль беларускіх гістарычных тэкстаў гэтага перыяду вызначаецца хранікальнасцю, аналітычнасцю і ў той самы час мае адзнакі мастацкасці. Мова помнікаў, інтэграваўшы шматлікія рознаўзроўневыя элементы народнай гаворкі і набыўшы такім чынам вобразнасць жывога маўлення, характарызуецца выразнасцю і экспрэсіўнасцю.

Перыяд функцыянавання новай беларускай літаратурнай мовы прыпадае на час фарміравання беларускай нацыі. Тэарэтычнай базай вылучэння гэтага перыяду выступаюць працэсы ідэйна-палітычнага і нацыянальна-культурнага адраджэння, якія пачалі набіраць сілу на беларускіх землях у другой палове XIX ст. і працягнуліся ў XX ст. Найважнейшай асаблівасцю гэтага перыяду з'яўляецца яго прамая абумоўленасць тэндэнцыямі, што бяруць пачатак у сферы СМІ. Гаворка ідзе ў першую чаргу пра дзейнасць газеты «Наша ніва» – грамадска-палітычнага, навукова-папулярнага і літаратурна-мастацкага выдання, якое выходзіла ў 1906–1915 гг. «Змяшчаючы артыкулы па спецыяльных і палітычных пытаннях, газета садзейнічала развіццю нацыянальнай свядомасці рабочых, выконвала асветніцкія задачы. Шмат увагі ўдзяляла яна і роднай мове»[12]. У рэдакцыі выдання працавалі такія выдатныя дзеячы беларускага нацыянальна-культурнага руху, як Іван і Антон Луцкевічы, В. Ластоўскі, Я. Купала, Ядвігін Ш. і інш. У газеце друкаваліся публіцысты А. Уласаў, А. Луцкевіч, В. Ластоўскі, Л. Гмырак, вядомыя літаратары Я. Колас, М. Багдановіч, Цётка, А. Гарун, Ц. Гартны, У. Галубок, З. Бядуля, М. Гарэцкі і інш. Даследчыкі мовы М. П. Лобан, А. К. Юрэвіч і А. І. Яновіч адзначаюць вялікую ролю выдання ў складанні норм беларускай літаратурнай мовы ў першыя два дзесяцігоддзі XX ст. «Прыход у літаратуру вялікага атрада пісьменнікаў з розных мясцовасцей Беларусі, удзел карэспандэнтаў з розных яе куткоў стварылі магчымасць замацаваць як норму найбольш пашыраныя моўныя з'явы»[13]. Газета «Наша ніва» аказала ўплыў на фарміраванне моўнага забеспячэння функцыянальных стыляў і асобных лексічных пластоў беларускай мовы. Публікацыя на старонках выдання матэрыялаў прыродазнаўчай, біялагічнай, медыцын-

[11] *Слука А. Г.* Беларуская журналістыка…
[12] Беларуская мова : энцыклапедыя / пад. рэд. А. Я. Міхневіча. Мінск : Беларус. энцыкл., 1994. С. 384.
[13] Там жа.

скай, эканамічнай накіраванасці садзейнічала зараджэнню навуковага стылю беларускай мовы. Змяшчэнне разнастайных паведамленняў, аб'яў, праграм, справаздач і зваротаў у газеце дазволіла ўвесці ў шырокі грамадскі ўжытак беларускія лексемы і сінтаксічныя канструкцыі, характэрныя для афіцыйна-дзелавога стылю. Закранаючы актуальныя пытанні жыцця таго часу, выданне было індыкатарам семантычных, лексічных, словаўтваральных і сінтаксічных працэсаў, што адбываліся ў жывым маўленні ў сувязі з развіццём грамадска-палітычнай думкі, зменамі ў сацыяльнай палітыцы, прамысловасці, эканоміцы, гандлі, ваеннай справе і г. д. Значны ўклад унесла газета «Наша ніва» і ў афармленне корпуса беларускіх тэрміналагічных адзінак у галіне паліталогіі, адміністратыўнага кіравання і справаводства. Спецыфіка публіцыстычнага газетнага маўлення, заснаваная ў тым ліку і на эмацыйным уздзеянні на чытача, стала падмуркам для фарміравання на аснове народна-гутарковых рэсурсаў такіх лексікасемантычных пластоў новай літаратурнай беларускай мовы, як абстрактныя, памяншальна-ласкальныя і экспрэсіўна-ацэначныя словы.

Такім чынам, дзейнасць выдання «Наша ніва» на аснове сістэмы вусна-гутарковай камунікацыі з неакрэсленымі ў сілу экстралінгвістычных прычын межамі і несфармаванымі правіламі на працягу нязначнага перыяду часу (меней за 10 гадоў) дазволіла закласці лінгвістычную аснову для развіцця літаратурнай формы нацыянальнай мовы і акрэсліць базавыя прынцыпы яе нармавання. Гэта сітуацыя ярка і пераканаўча ілюструе не толькі фарміравальную ролю СМІ і медыямаўлення ў мадэляванні сацыяльна-культурных і грамадска-палітычных працэсаў, але і ролю медыя як аднаго з галоўных фактараў працэсу адбору (або стварэння), назапашвання, тэсціравання і, нарэшце, кадыфікавання рознаўзроўневых моўных форм у якасці нармаваных адзінак.

У межах трэцяга перыяду фарміравання беларускай мовы айчынны медыятэкст атрымаў фармальнае развіццё ў выглядзе радыётэксту, тэксту тэлебачання і інтэрнэт-тэксту. Ва ўсіх названых разнавіднасцях ён аказваў, аказвае і, відавочна, будзе аказваць істотны ўплыў не толькі на узус, але і на літаратурную норму.

## Заключэнне

Такім чынам, лёс беларускага медыятэксту і лёс беларускай мовы як нацыянальнай мовы нашага народа звязаны паміж сабой. Гэтую сувязь забяспечваюць агульныя экстралінгвістычныя (гісторыка-палітычныя, сацыяльна-эканамічныя, этнакультурныя) і лінгвістычныя абставіны іх існавання і развіцця. З аднаго боку, беларускі медыятэкст з'яўляецца найбольш адэкватным адлюстраваннем актуальных для пэўнага часу працэсаў, што адбываліся ў беларускай мове, а з другога – сам выступае у якасці суб'екта моватворчасці. Адпаведна, медыятэкст у канкрэтных гістарычных акалічнасцях немагчыма разглядаць у адрыве ад мовы, на якой ён створаны, і яе грамадскай ролі ў гэты перыяд. У такім аспекце мова выступае адным з найважнейшых зместавых кампанентаў семантычнай структуры медыятэксту. Па нашым меркаванні, мову і медыятэкст варта разглядаць у якасці ўзаемазвязаных элементаў адной сістэмы, а тэмпы іх гістарычнай дынамікі варта вызначаць зыходзячы з асноўных крытэрыяў храналагічнай сістэматызацыі і ў адпаведнасці з агульнымі падыходамі да яе.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Уэбстер Ф. *Теория информационного общества*. Арапов МВ, Малыхина НВ, переводчики; Вартанова ЕЛ, редактор. Москва: Аспект Пресс; 2004. 400 с.

2. Маклюэн ГМ. Понимание медиа: внешние расширения человека. Николаев В, переводчик. Москва: Канон-пресс-Ц, Кучково поле; 2003. 464 с.

3. Popper K. *After the open society: selected social and political writings.* Shearmur J, Turner PN, editors. New York: Routledge, 2008. 493 p. DOI: 10.4324/9780203371060.

4. Ивченков ВИ. Журналистика как сфера научного познания (к вопросу об аттестации научных кадров). В: Высшая аттестационная комиссия Республики Беларусь. *Советы по защите диссертаций в системе аттестации кадров высшей научной квалификации. Материалы научно-практической конференции; 29 ноября 2018 г.; Минск, Беларусь.* Минск: Высшая аттестационная комиссия Республики Беларусь; 2019. с. 33–35.

5. Слука ОГ. Методология формирования политического сознания. У: Бяляеў АВ, рэдактар. *Журналістыка-2023: стан, праблемы, перспектывы. Матэрыялы 25-й Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі; 22 лістапада 2023 г.; Мінск, Беларусь.* Мінск: БДУ; 2023. с. 200–203.

6. Булацкі РВ, Сачанка II, Говін СВ. *Гісторыя беларускай журналістыкі.* Мінск: БДУ; 1979. 432 с.

7. Борейко АД. Периодизация и аспекты изучения организационной деятельности СМИ. *Журнал Белорусского государственного университета. Журналистика. Педагогика.* 2020;2:4–12.

8. Слука ОГ. Идеология информационного пространства Республики Беларусь. *Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка.* 2010;2:56–60.

*Статья поступила в редколлегию 05.07.2024.*
*Received by editorial board 05.07.2024.*